# Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а

Урок беларускай мовы ў 5 класе

**Л. М. Цярэшчанкава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
СШ № 5 г. Рагачова

**Мэта:** засваенне правілаў вымаўлення і напісання о, э, а ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах.

**Задачы:**

- узнавіць веды пра правапіс і вымаўленне галосных о, э, а;
- выпрацаваць уменне правільнага пісьма на правапіс галосных о, э, а;
- замацаваць на практыцы.

**Тып урока:** тлумачэнне новага матэрыялу.

**Формы работы на ўроку**: індывідуальная, франтальная, групавая.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне**: вучэбны дапаможнік для 5 класа, выкарыстанне сродкаў ІКТ, прымяненне прыёмаў візуалізацыі, наглядны і раздатачны матэрыял.

## Ход урока

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

**Мэты этапу**: стварэнне спрыяльнай атмасферы на навучальным занятку, увядзенне ў атмасферу зносін, прагназаванне канчатковага выніку навучальнага занятку.

**Настаўнік.** Добры дзень, рабяты! Паглядзіце адзін на аднаго, падарыце ўсмешку сябру, паглядзіце шчыра, як могуць сапраўдныя беларусы. Сёняшні ўрок я хацела б пачаць наступнымі радкамі.

Меднастволы, як выліты, высіцца бор,
Зацвітае на ўзлессі блакітны чабор,
Заглядзелася сонца ў люстра азёр, –
Гэта ты, мая Беларусь!

Сіні ранак. Дзяўчына збіраецца жаць,
На плячы маладзік – серабрысты серп,
А наўкол наліўныя сады ляжаць,
Бурштыновыя яблыкі ў расе, –
Гэта ты, мая Беларусь!

Скажыце, калі ласка пра што гэты верш? Як трэба ставіцца да сваёй роднай краіны?

Ганарыцеся тым, што вы беларусы, што давялося вам тут нарадзіцца ў маляўнічым краі. Любіце, шануйце, узбагачайце і не саромцеся размаўляць па-беларуску. Калі жывая мова, то і народ жывы як нацыя. Спадзяюся, і мы з вамі на ўроку будзем добра размаўляць і выказвацца па-беларуску.

Зараз прапаную зазірнуць у цікавыя гістарычныя мясціны Беларусі і назваць, якое перад вамі месца. *(На слайдзе па чарзе з'яўляюцца фотаздымкі знакамітых мясцін Беларусі. Пад кожным фотаздымкам напісана слова з выдзеленай літарай).*

Рабяты, хто здагадаўся што гэта за месца? Плошча Перам**О**гі.

А на гэтай ілюстрацыі? Бр**Э**сцкая кр**Э**пасць – герой.

На наступнай выяве? Вялікі т**Э**атр оперы і балета Р**Э**спублікі Бел**А**русь.

Я невыпадкова чырвоным колерам выдзеліла асобныя літары ў гэтых словах. Скажыце, калі ласка, што іх аб'ядноўвае?

Зыходзячы з гэтых літар, як вы лічыце, якая тэма сённяшняга ўрока? Тэма ўрока: «Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а».

Рабяты, што вы ведаеце пра літары о, э, а?

Да канца ўрока вы даведаецеся пра вымаўленне і правапіс о, э, а ў спрадвечна беларускіх словах, пра правапіс о, э, а ў запазычаных словах, а таксама пра ролю націску пры правапісе о, э, а. На працягу ўрока вы будзеце выконваць заданні ў маршрутным лісце. Напішыце дату і падпішыце яго.

Вы ўжо знаёмыя з галоснымі літарамі о, э, а. Прапаную праверыць дамашняе заданне ў форме гульні «Так ці не». Свае адказы фіксуйце ў маршрутным лісце.

- ✓ У слове арэх два склады, так ці не?
- ✓ Ў нескладовае гэта галосны гук, так ці не?
- ✓ У беларускай мове шэсць галосных гукаў, так ці не?
- ✓ У беларускай мове дзевяць галосных літар, так ці не?
- ✓ Літары е, ё, ю, я, і могуць абазначаць два гукі, так ці не?
- ✓ Літара ё пасля зычнай абазначае два гукі, так ці не?

| | ТАК | НЕ |
|---|---|---|
| 1. | + | |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | | - |
| 3. | + | |
| 4. | | - |
| 5. | + | |
| 6. | | - |

**Настаўнік.** Падыміце руку, у каго ўсё зроблена беспамылкова. Падыміце руку, у каго адна памылка. *(Спытаць, у якім пытанні памыліўся.)* Падыміце руку, у каго дзве памылкі. Будзьце ўважлівы. Вам неадходна паўтарыць правіла на старонцы 10 падручніка. І я ўпэўнена, у наступны раз вы не памыліцеся.

Як вы ўжо, напэўна, здагадаліся, вы будзеце працаваць у групах. Але спачатку нагадаем правілы групавой работы.

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап**

**Мэта этапу:** авалоданне зместам тэмы ўрока і спосабамі пазнавальнай дзейнасці.

**Настаўнік.** Звярніце ўвагу на апорную схему патрэбнага нам матэрыялу *(адкрыць крыло дошкі, дзе размешчаны плакат-схема).* Прапаную кожнай групе выканаць заданне пад № 1, карыстаючыся правілам падручніка. Лісты з заданнем ляжаць у вас на сталах. На падрыхтоўку вам адводзіцца 2 хвіліны:

- ✓ 1-я група будзе вывучаць, як пішыцца о, э, а ў спрадвечна беларускіх словах;
- ✓ 2-я група будзе вывучаць, як пішуцца словы са спалучэннямі -ро-, -ло;
- ✓ 3-я група будзе вывучаць, як передаюцца ненацiскныя спалучэнні -эль, -эр- у запазычаных словах;
- ✓ 4-я група будзе вывучаць, як пішацца спалучэнне -эр- ва ўласных імёнах, прозвішчах, геаграфічных назвах.

Папрашу выйсці па чарзе ад кожнай групы па ўдзельніку для выканання задання, астатнія выконваюць разам ў раздрукоўках.

**LearningApps**

| **О** | **А** | **Э** |
|---|---|---|
| хОлад | майстАр | сЭрца |
| вОдны | сАрдэчны | вАдзіца |
| | | ЮпітЭр |
| | | МільярдЭр |

**Настаўнік.** А што мы ўжо ведаем пра правапіс о, э, а? Вось вы заўсёды гаворыце, што галосная літара -э- пішацца толькі пад націскам, звярніце ўвагу на слайд *(на экран вывесці словы: экзамен, экскурсія, рэспубліка, чэмпіён, дэталь)*. А што мы бачым тут, што з літарай -э- адбываецца?

Што гэта за словы? І так звернем увагу на правіла на старонцы 27. Дык вось, запомніце! У словах іншамоўнага паходжання ў пачатку і ў сярэдзіне э можа быць і не пад націскам, а таксама ў сярэдзіне пасля зацвярдзелых і Д, Т. Якую ролю націск выконвае, даведаемся далей, працуючы ў групах.

**ІІІ. Кантрольна-карэкцыйны этап**

**Мэта этапу:** стварэнне ўмоў для дасягнення ўсімі навучэнцамі запланаваных вынікаў, аналізу навучэнцамі сваёй дзейнасці і матывацыі на далейшую працу па дадзенай тэме.

**Настаўнік.** Зараз кожная група вучняў атрымае заданне, на выкананне якога вам адводзіцца 5 хвілін. Не спяшайцеся, будзьце ўважлівымі. Лічыльнікі часу, калі ласка, сачыце за часам.

**<u>Група 1. Работа з прыёмам “Воблака слоў”</u>**




**Заданні:**

А. Знайдзіце тры словы на правапіс о, э, а, падбярыце да іх аднакаранёвыя, каб О пераходзіла ў А. Растлумачце правапіс галосных.

МарОзны – марАзы, звОнкі – звАнчэй, пОле – пАлі.

Б. Знайдзіце два словы на правапіс о, э, а, падбярыце да іх аднакаранёвыя, каб А пераходзіла ў О. Растлумачце правапіс галосных.

ПахАладзеўшыя – хОлад, бАры – бОр.

**Здароўезберагаючая паўза**

**Настаўнік.** Прапаную хвілінку адпачынку. Адпачывайце, але слухайце ўважліва. Заплюшчыце вочы і ўявіце сабе кляновы лісток – гэта жамчужына

беларускага сэрца возеры Нарач. Удыхніце глыток свежага паветра, прыслухайцеся, як шапоча вецер. І трэба быць чэрствым, прыземленым чалавекам, каб усяго гэтага не заўважаць, не любавацца гэтым. Бо менавіта такія простыя, але мілыя рэчы надаюць сэнс нашаму жыццю, вучаць любіць, захапляцца, здзіўляцца нават самаму малому, бо ўсё вялікае з гэтага малога і адбываецца.

Зараз прагучалі словы, якія адносяцца да нашага правіла. Назавіце мне іх.

**<u>Група 2. Работа з прыёмам “Філворд”</u>**

Ы Л П Б Л Ы ХА

Т А Г О Н Ь Ц А

Ы Ш Б Р Р Ы Ы Т

Р Ы   Ы Г М Л Г

К Ц Ь В О Е Ц Ь

Я Н Т О В Ы Р Д

**Заданне:** да прапанаваных слоў падбярыце пару, каб спалучэнні РО, ЛО чаргаваліся з РЫ, ЛЫ. Запішыце, выдзеліце ў словах арфаграму. Растлумачце іх правапіс.

Дровы (8) – дрывотня,   гром (7) – грымець, блохі (5) – блыха, плот (8) – плытагон, крошка (7) – крышыць, бровы (5) – брыво, глотка (7) – глытаць.

**<u>Група 3. Работа з прыёмам “Кросэнс”</u>**

  

   ?   

  

**Заданне:** вызначце якім правілам аб’яднаны ілюстрацыі, патлумачце яго. Такое для нас новае слова, як фарватар, што абазначае?

**Група 4. Работа з прыёмам “Скрайбінг”**

**Заданне:** выберыце з прапанаваных сказаў пэўныя словы, перадайце іх малюнкамі, патлумачце, чаму менавіта гэтыя словы вамі ўзяты для графічнай перадачы.

1) Мой бацька працуе інжынерам.

2) І дзіўна – капыты ў іх не жорсткія, нягледзячы на тое, што яны вечна на камянях, а нейкія пругкія, быццам з цвёрдай рызіны.

3) Усё было ў трывозе і ў турбоце, але з-за чаго?

4) Добры почырк мне часам дапамагаў.

5) Двое падбеглі да машыны і, заскочыўшы ў кузаў, сарвалі брызент.

6) А яблык быў наліўны, так і хацелася яго з’есці.

**Настаўнік.** Вазьміце свае маршрутныя лісты і адзначце, побач з табліцай, хто абараняў заданне і дапамагаў у падрыхтоўцы. Зараз вазьміце свае тэлефоны, прайдзіце па спасылцы ў нашу агульную суполку і выканайце анлайн-тэст. На выкананне яго вам адводзіцца 5 хвілін. Вынікі тэсту пазначце ў свае маршрутныя лісты У сваіх маршрутных лістах падлічыце колькасць атрыманых балаў.Сакратары, збярыце маршрутныя лісты сваёй групы і здайце мне. Я яшчэ раз іх прагледжу і на наступным уроку абмяркуем.

Прапаную вам вярнуцца да мэты ўрока і пры дапамозе светлафора прадумаць, што атрымалася, а чаго, магчыма, дасягнулі не ў поўнай меры.

Калі вы ведаеце на “выдатна”, то ўзніміце карткі з зялёным колерам, калі сумняваецеся, то з жоўтым, калі адчувалі цяжкасці, то з чырвоным.

Зараз запішыце дамашняе заданне ў дзённікі. Старонка № 27, практыкаванне 56. Згодна ўмове, патрэбна спісаць тэкст і замест кропак уставіць літары о, э ці а.

Завяршыць урок я хацела б словамі: “Магчыма ўсё. А часам, што здаецца немагчымым, проста патрабуе больш часу”. Заўсёды свой час выкарыстоўвайце з карысцю для развіцця. Дзякуй за ўрок.